РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**СЕРАДПО́СЦЕ**, Серадпосніца, Сяродпосце, Прапалоўны дзень, Хрэстцы, у нар. календары абазначэнне сярэдзіны *Вялікага посту*. У розных месцах Беларусі ў гэты дзень гаспадыні выпякалі з цеста крыжы («храсты», «хрэшчыкі») і інш. прадметы найчасцей у выглядзе розных прылад працы (сахі, бараны, касы, сярпа). «Хрэшчыкі» хавалі за абразамі, дзе яны ляжалі на працягу года і выкарыстоўваліся сямейнікамі пры розных выпадках: у пачатку гаспадарчых работ (напрыклад, пры заворванні, сяўбе, зажынках) — каб быў добры ўраджай, у дзень запасвання гавяды — каб яе не зачапіў звер; у час навальніцы або граду, пры паводках, пажары, паморку. Клалі крыжы з цеста і ў засекі з мукою і зернем, «каб нячыстая сі-

ла не паскудзіла». Адзін з такіх крыжыкаў павінен быў знаходзіцца ў сявеньцы сейбіта. Верылі, што «хрэшчыкі» даюць спор, засцерагаюць ад усяго ліхога (ад ведзьмаў, чараўнікоў). Іх давалі дзецям, каб тых абыходзілі хваробы; з'ядалі, каб у жніво не балела сярэдзіна. Назіранне за надвор'ем у дзень, які дзяліў пост пароўну, давала магчымасць селяніну рабіць свае прадказанні. Жыхары надрэчных вёсак гаварылі, што ў дзень С. «шчупак хвастом лёд разбівае». На Віцебшчыне цеплыня і пагода на С. абяцалі неўраджай на ягады, грыбы і арэхі. Такі ж стан у заходніх раёнах Беларусі гарантаваў усё лета пагодлівае, а дождж або снег, што ішлі на С., прымушалі настроіцца на мокрае лета.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ